Рэктару Мінскага дзяржаўнага
лінгвістычнага ўніверсітэта
Баранавай Наталлі Пятроўне.

**Зварот Праваабронча цэнтра “Вясна”
з нагоды адлічэння студэнткі Мінскага дзяржаўнага
лінгвістычнага ўніверсітэта Елізаветы Пракопчык.**

Шаноўная спадарыня рэктар!

Праваабронччы цэнтр “Вясна” выказвае сур’ёзную заклапочанасць у сувязі з адлічэннем студэнткі МДЛУ Елізаветы Пракопчык з прычыны яе актыўнай грамадскай пазіцыі, накіраванай на ўвядзенне ва ўніверсітэце дыстанцыйнага навучання з-за распаўсюджання каранавіруснай інфекцыі.

Елізавета Пракопчык была адлічана з універсітэта пасля ўдзелу 19 сакавіка 2020 г. у акцыі студэнтаў каля выхаду са станцыі метро “Плошча перамогі”. Акцыя была арганізавана з мэтай прыцягнуць увагу кіраўніцтва ўніверсітэта да неабходнасці ўвядзення карантыну і пераводу навучання на дыстанцыйную форму. Сама Елізавета Пракопчык у знак нязгоды заклікала да байкоту заняткаў ва ўніверсітэце і да самаізаляцыі студэнтаў, пасля чаго не з’яўлялася на занятках на працягу двух тыдняў.

Праваабронччы цэнтр “Вясна” расцэньвае вынясенне вымовы і наступнае адлічэнне студэнткі з універсітэта як незаконнае і не сувымернае пакаранне, звязанае з актыўнай грамадскай пазіцыяй студэнткі, на падставе наступнага:

У адпаведнасці з абз.3 ч.2 арт.128 Кодэкса аб адукацыі адлічэнне як мера дысцыплінарнай адказнасці можа быць прыменена за сістэматычнае (паўторнае на працягу года) невыкананне альбо неналежнае выкананне навучэнцам сваіх абавязкаў, калі да яго раней прымяняліся меры дысцыплінаргана спагнання.

Пунктам чацвёртым арт.132 Кодэкса аб адукацыі прадугледжана, што за кожны дысцыплінарны праступак можа быць прыменена толькі адна мера дысцыплінарнага спагнання.

Такім чынам, для прымянення дысцыплінарнага спагнання неабходна наяўнасць двух юрыдычных фактаў: студэнт павінен сістэматычна невыконваць абавязкі навучэнца і да студэнта раней павінны былі прымяняцца меры дысцыплінарнага спагнання.

Звяртаем увагу на тое, што ў выпадку з трэцім спагнаннем Елізаветы Пракопчык адсутнічае факт неналежнага выканання абавязкаў навучэнца, таму што ненаведванне ёй заняткаў была прадыктавана наяўнасцю паважнай прычыны, звязанай з клопатам пра сваё здароўе.

У адпаведнасці з арт.126 (п.1.1.) Кодэкса аб адукацыі падставай для прыцягнення навучэнца да адказнасці з’яўляецца няяўка на вучэбныя заняткі толькі без паважных прычын. Сама па сабе няяўка на заняткі не з’яўляецца неналежным выкананнем абавязкаў навучэнцам і не можа разглядацца як падстава для прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці, калі маюцца паважныя прычыны пропуску заняткаў.

Згодна з п.3 арт.128 Кодэкса аб адукацыі, права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць кіраўніку ўстановы адукацыі. Пры выбары меры дысцыплінарнага спагнання

павінны улічвацца прычыны дысцыплінарнага праступка. Гэта значыць, адміністрацыя ўніверсітэта павінна праводзіць усебаковую і дбайную ацэнку прычын, па якіх Елізавета Пракопчык адсутнічала на занятках.

Пры ўліку спасылак на прыведзеныя прававыя нормы неабходна ўлічваць і кантэкст, у якім адбылося адлічэнне студэнткі Елізаветы Пракопчык. Сусветная арганізацыя аховы здароўя аб’явіла ў свеце пандэмію ў сувязі з распаўсюджаннем каранавіруснай інфекцыі і заклікала ўсе дзяржавы праводзіць прафілактычныя меры па недапушчэнню яе распаўсюджання. Пры гэтым Беларусь не прадпрымае актыўных дзеянняў, накіраваных на прафілактыку распаўсюду «COVID-19» і не зачыняе навучальныя ўстановы на каранцін, не ўводзіць паўсюдна дыстанцыйнае навучанне студэнтаў.

З улікам выкладзенага, калі ў свеце памерла больш за 80 тысяч чалавек і да гэтага часу не знойдзена вакцыны ад захворвання, а Елізавета Пракопчык мела да гэтага шэраг захворванняў (запаленне лёгкіх, бранхіт), яе дзеянні былі прадыктаваны клопатам пра сваё здароўе. Адпаведна, прычына пропуску заняткаў павінна быць прызнана ў гэтым выпадку паважнай, а спагнанне адменена як незаконнае. Адміністрацыяй універсітэта ў парушэнне п.3 арт.128 Кодэкса аб адукацыі не было дадзена дбайнай ацэнкі абставінам, па якіх Елізавета Пракопчык прапусціла два тыдні заняткаў, падчас якіх яна знаходзілася на самаізаляцыі ў мэтах клопату пра сваё здароўе.

На падставе вышэйпададзенага **настойліва прашу**:

Адмяніць спаганне Елізаветы Пракопчык і аднавіць яе ў правах студэнткі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Не выкарыстоўваць да студэнтаў меры дысплінарнана спагнання ў мэтах спынення іх грамадскай актыўнасці. Бо гэта з’яўляецца прамым парушэннем свабоды выказвання меркавання, гарантаваная беларускім грамадзянам дзеючай Канстытуцыяй і палажэннямі Міжнароднага Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

У адваротным выпадку, мы будзем вымушаныя праінфармаваць міжнародную супольнасць пра парушэнне Вашым універсітэтам нормаў Балонскага працэсу, пра перaслед у Вашым універсітэце студэнцкай актывісткі Е. Пракопчык, якая бароніць свае правы і правы іншых студэнтаў падчас эпідэміі каронавірусу.
Таксама мы будзем вымушаныя паставіць пытанне пераследу студэнткі Е. Пракопчык перад замежнымі ўніверсітэтамі ды іншымі інстытуцыямі, якія маюць навучальныя і працоўныя кантакты з Вашым універсітэтам, з тым, каб яны сур’ёзна разглядзелі далейшыя перспектывы супрацоўніцтва.

***Алесь Бяляцкі,***
***старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна”,***
***лаўрэат прэміі Вацлава Гавэла за правы чалавека Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы.***

09.04.2020 г.